УДК 947.6.«1917»

**І. М. Рыжанкоў**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦЬ СЯЛЯНСТВА НА ЭТАПЕ РАЗГОРТВАННЯ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ: ПА МАТЭРЫЯЛАХ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ

У артыкуле паказваюцца роля і месца грамадска-палітычных арганізацый у праграме палітычнага рэфармавання дзяржавы і надання сялянскай актыўнасці дэмакратычных формаў вырашэння злабадзённых праблем. У першыя месяцы лютага адбыліся карэнныя змены ў палітычнай сістэме Расіі. Аўтарытэтнымі і ўплывовамі палітычнымі інстытутамі сталі партыі і грамадскія арганізацыі, якія ў згодзе з урадавымі структурамі прыступілі да будаўніцтва дэмакратычнай дзяржавы. З сакавіка па чэрвень 1917 г. на Віцебшчыне была створана сетка сялянскіх грамадска-палітычных арганізацый: Сялянскі саюз, Саветы сялянскіх дэпутатаў. У сваіх пастановах сялянскія арганізацыі выказалі рашучаю падтрымку арміі, хлебнай манаполіі, выказвалі гатоўнасць падтрымліваць фронт, вайну да пераможнага канца, удзельнічаць у выбарах ва Устаноўчы сход, дэпутатам якога належала вырашаць цэнтральнае пытанне таго часу – правядзенне зямельнай рэформы. Праяўленнем палітычнай актыўнасці сялян з'яўлялася рашучая падтрымка харчовых урадавых мерапрыемстваў. І гэтую падтрымку на пачатковым этапе рэвалюцыі сяляне выказалі. У сваёй масе сялянства Віцебшчыны не паказала ўстойлівую палітычную пазіцыю, і далей карпаратыўныя інтарэсы пераважалі над дзяржаўнымі. Сялянства не выяўляла значнай зацікаўленасці да дзейнасці Саветаў у параўнанні з валаснымі (выканаўчымі), зямельнымі і харчовымі камітэтамі, і часцей разглядала іх як сродак для вырашэння сваіх гаспадарчых пытанняў. Паслабленне дзяржаўнай улады і неразвітасць дэмакратычных інстытутаў узмацнялі магчымасці валасных выканаўчых органаў для злоўжыванняў на карысць іх выбаршчыкаў. Калі прысутнасць на выбарных пасадах першага складу значнай колькасці заможных элементаў тлумачылася адсутнасцю сялянскіх кандыдатаў, здольных выконваць функцыі кіравання, то ў далейшым «грамадзяне-земляробы» адносна хутка засвоілі карысць ад удзелу ў дзяржаўных установах і метадам перавыбараў пазбаўляліся ад непажаданых асоб.

**Ключавыя словы:** рэвалюцыя, рэформы, Часовы ўрад, сялянства, аграрнае пытанне.

**Для цытавання:** Рыжанкоў І. М. Грамадска-палітычныя арганізацыі і жыццядзейнасць сялянства на этапе разгортвання Лютаўскай рэвалюцыі: па матэрыялах Віцебскай губерні // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2024. № 2 (287). С. 17–20.
DOI: 10.52065/2520-6885-2024-287-3.

**I. M. Ryzhankou**
Belarusian State Technological University

# SOCIO-POLITICAL ORGANIZATIONS AND THE VITAL ACTIVITY OF THE PEASANTRY AT THE STAGE OF THE FEBRUARY REVOLUTION UNFOLDING: BASED ON THE MATERIALS OF THE VITEBSK PROVINCE

The article indicates the role and place of socio-political organizations in the program of political reform of the state and giving peasant activity to democratic forms of solving topical problems. In the first months of February, fundamental changes took place in the Russian political system. Parties and public organizations have become authoritative and influential political institutions, which, in agreement with government structures, have begun to build a democratic state. From March to June 1917, a network of peasant socio-political organizations was created in the Vitebsk region: the Peasant Union, Councils of Peasant Deputies. In their resolutions, peasant organizations expressed strong support for the army and the grain monopoly, expressed their readiness to support the front, the war to the bitter end, and participate in elections to the Constituent Assembly, whose deputies had to solve the central issue of that time – land reform. The manifestation of the political activity of the peasants was the active support of food government activities. And the peasants expressed this support at the initial stage of the revolution. For the most part, the peasantry of the Vitebsk region did not show a stable political position and further corporate interests prevailed over state ones. The peasantry did not show significant interest in the activities of the soviets, compared with the volost (executive), land and food committees, and more often considered them as a means to solve their economic issues. The weakening of State power and the

underdevelopment of democratic institutions increased the possibilities of volost executive bodies for abuse in favor of their constituents. If the presence of a significant number of wealthy elements in elected positions of the first composition was explained by the lack of peasant candidates capable of performing leadership functions, then in the future «citizen farmers» relatively quickly learned the benefits of participating in public institutions and got rid of undesirable persons by re-election.

**Keywords:** revolution, reforms, Provisional Government, peasantry, agrarian question.

**For citation:** Socio-political organizations and the vital activity of the peasantry at the stage of the February Revolution anfolding: based on the materials of the Vitebsk province. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2024, no. 2 (287), pp. 17–20 (In Belarusian).

DOI: 10.52065/2520-6885-2024-287-3.

**Уводзіны.** У першыя месяцы лютага адбыліся карэнныя змены ў палітычнай сістэме Расіі. Аўтарытэтнымі і ўплывовамі палітычнымі інстутатамі сталі партыі і грамадскія арганізацыі, якія ў супрацоўніцтве з урадавымі структурамі прыступілі да будаўніцтва дэмакратычнай дзяржавы. У сакавіку – красавіку 1917 г. адбываліся маніфістацыі, мітынгі, шэсці ў гонар новага ладу. Працягам Лютаўскай рэвалюцыі з'явілася стварэнне сеткі сялянскіх грамадска-палітычных арганізацый: Сялянскі саюз, Саветы сялянскіх дэпутатаў.

**Асноўная частка.** Аб жаданні сялян удзельнічаць у палітычным жыцці і «не адчужаць іх ад астатніх груп насельніцтва» было адзначана 6 сакавіка ўдзельнікамі пасяджэння Віцебскага гарадскога камітэта. У адказ А. Валковіч і М. Кандрацьеў паведамілі, што пытаннем арганізацыі сялянства маюць намер займацца губернскі і павятовыя камісары [1]. Варта заўважыць, што станоўчую ролю ў справе згуртавання вяскоўцаў Расіі, у тым ліку беларускага краю, вакол ідэі паспяховай рэалізацыі хлебнай манаполіі адыгралі рэзалюцыі Усерасійскага з'езда Саветаў сялянскіх дэпутатаў, які адбыўся з 4 па 28 мая 1917 г. Колькасную перавагу сярод дэлегатаў ад беларускіх губерняў на форуме мелі Мінская – 28, Магілёўская – 24, Віцебская – 16, Віленская – 9, Гродзенская – 6. Адным з першых рашэнняў сялянскіх дэлегатаў з'явілася пастанова па харчовым пытанні, якая заклікала вяскоўцаў падтрымаць цвёрдыя цэны і манапалію на хлеб [2]. Газета «Русское слово» ад 16 мая паведамляла, што манаполія прызнавалася «адзіным выйсцем са страшэннага становішча і заблытанага палажэння».

Эсэраўскі па партыйным складзе з'езд прыняў адпаведную аграрную рэзалюцыю, якая абвяшчала, што зямельнае пытанне належыць вырашаць сялянскім дэпутатам ва Устаночым сходзе. Прычым увесь зямельны фонд павінен стаць агульнанародным здабыткам для ўраўняльнага працоўнага карыстання без выкупу.

Таксама выказвалася пажаданне аб пераходзе зямлі ў веданне зямельных камітэтаў, з наданнем ім права вызначэння парадку апрацоўкі палёў, пакосу травы. Прапановы бальшавікоў па сялянскім пытанні аб саюзе найбяднейшага сялянства і рабочага класа не атрымалі шырокай і шчырай падтрымкі з боку дэпутатаў.

Разам з тым калуары сялянскага форуму выявілі няўстойлівасць палітычных перакананняў вяскоўцаў. Так, газета «Русское слово» ад 13 мая прывяла да прыкладу ўрывак з размовы двух удзельнікаў з'езда: «Да не разумеюць мужыкі ў партыях. Не цікавяцца... Да іх хто не прыйдзе, толькі скажы: «зямля», – і добра». Цікавымі назіраннямі дзялілася газета «Народнае слова». У прыватнасці, у нумары ад 18 чэрвеня адзначалася, што «з сацыялістам ён (селянін) сацыяліст, з анархістам – анархіст, з буржуем – буржуй». У гэтай сувязі газета падсумоўвала, што «ён з усім быццам згодзен, усе кропкі гледжання прыстасуе да сваёй мэты».

Член агітацыйнай групы пры Віцебскім губернскім земстве Ладэс, які знаходзіўся з камандзіроўкай у Дрысенскім павеце з 29 красавіка па 23 мая скардзіўся на недахоп культурных сіл «…жадаючых працаваць са мной не знайшлося. Акрамя Сялянскага саюза ніякіх арганізацый няма» [3].

Адсутнасць грамадска-палітычнай самаідэнтыфікацыі земляробаў выявілася яшчэ на пачатковым этапе арганізацыі сялянства. Так, са спазненнем адбывалася арганізацыя вяскоўцаў Віцебшчыны, асабліва гэта тычылася іх згуртавання на ўзроўні губерні. Так, 28 красавіка адбыўся павятовы сялянскі з'езд у Дрысе, 7 мая ў Віцебску, 9 мая ў Гарадку (500 чалавек), у другой палове мая ў Лепелі, 8–9 чэрвеня ў Полацку (215 дэлегатаў).

Як правіла, арганізатары форумаў уносілі ў парадак дня наступныя пытанні: Устаноўчы сход, формы дзяржаўнасці, вайна і дэзерцірства, зямельнае пытанне, зямельныя камітэты і «прымірыцельныя камеры», харчовае пытанне і задачы (харчовых) камітэтаў, кааперацыя, Пазыка свабоды, школьная і пазашкольная адукацыя, нацыянальнае пытанне, выбары ва Усерасійскі з'езд сялянскіх дэпутатаў і прадстаўнікоў у харчовыя камітэты і інш. Рэзалюцыі мелі шырокі і ўсеабдымны характар і тычыліся практычна ўсіх абласцей палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурна-асветніцкага жыцця.

5 чэрвеня ў Віцебску на сходзе губернскага Арганізацыйнага камітэта пад старшынстам

Карпава было вырашана «перанаймаваць» Сялянскі саюз у Савет сялянскіх дэпутатаў. «Витебский листок» ад 13 чэрвеня» паведамляў, што ў працы губернскага сялянскага з'езда бралі ўдзел прадстаўнікі ўрадавых структур, грамадскія дзеячы, партыйцы РСДРП і ПС-Р.

Паказальна тое, што ў першы дзень працы тэмай для абмеркавання стала харчовая палітыка ўрада. Так, з паведамленнямі выступілі 30 вясковых дэпутатаў, прычым у сваёй большасці прамовы былі прысвечаны праблеме цвёрдых цэн на сельгаспрадукцыю. У прыватнасці, сялянскія прадстаўнікі прызналі пажаданым дамагацца ад Галоўнага (Агульнадзяржаўнага) харчовага камітэта правядзення рэквізіцыі хлебных запасаў у гандляроў і землеўласнікаў, якія маюць звыш 50 дзесяцін зямлі па старых цвёрдых цэнах.

16 чэрвеня 1917 г. упаўнаважаны М. Сямеўскі паведамляў А. Валковічу аб становішчы ў Невельскім павеце: «...большасць гатова чакаць Устаноўчага сходу. Сяляне да бягучых спраў адносяцца індыферэнтна. Цікавяцца толькі пытаннямі зямлі і вайны, але ў іх разбіраюцца кепска. У зямельным пытанні цікавяцца толькі прырэзкай кожнаму з іх зямлі з прылягаючых панскіх і казённых маёнткаў. Тыя хто і маюць дастатковую колькасць зямлі, заклапочаны адным, каб ад іх не адабралі якую-небудзь частку. Ідэя сацыялізацыі большасці не зразумела і з'яўляецца чуждай» [4].

Газета «Витебское слово» ад 17 чэрвеня адзначае, што па харчовым пытанні дэлегаты далучыліся да адпаведнай рэзалюцыі Усерасійскага форуму, «хлебная манаполія і цвёрдыя цэны на хлеб павінны быць захаваны і настойліва праводзіцца ў жыццё». Разам з тым сяляне выказалі пажаданне ўсталяваць цвёрдыя цэны на фабрычна-завадскія тавары (тканіну, жалеза, цукар і інш.), забяспечыць іх сельгасінвентаром і мінеральнымі ўгнаеннямі, перапыніць вытворчасць прадметаў раскошы, заклікаць у армію «чыноўнікаў, манахаў, рабочых і інш.».

Характэрна, што толькі на 4-ы дзень пункт «Аграрнае пытанне» быў разгледжаны сялянскімі прадстаўнікамі. Вядома, што на з'ездзе траплялiся размовы пра магчымасці правядзення неадкладнага падзелу зямлі. Але здаровы сэнс і своесаблівая сялянская мудрасць перамаглі правакацыі.

У прыватнасці, газета «Витебский листок» ад 17 чэрвеня прыгадала прадстаўніка Люцынскага павета, які прапанаваў пачакаць з падзелам зямлі да Устаноўчага сходу – «калі ж дзяліць зараз, то мы паб'емся». Рэзалюцыя паўтарала адпаведны дакумент Усерасійскага з'езда сялянскіх дэпутатаў аб недапушчальнасці захопаў і гвалту прыватнай зямельнай уласнасці і аб наданні Устаноўчаму сходу выключнага права вырашэння зямельнага пытання. З'езд прызнаў найлепшай формай дзяржаўнага кіравання дэмакратычную рэспубліку парламецкага тыпу. Сяляне Віцебшчыны адмовіліся ад варыянта фэдэрацыі, якая, як вядома, дапускала аўтаномію для беларускага краю. Праўда, скаргі мелі своеасаблівае тлумачэнне – менавіта той інтэлігенцыі, якая «б працавала рука аб руку з народам, захоўваючы інтарэсы народа». У некаторых мясцінах існавалі цяжкасці з доступам да перыядычных выданняў і літаратуры. Так, сялянскі прадстаўнік Дрысеншчыны адзначыў, што «самі справіліся б "дайце толькі літаратуры, дайце друкаваныя законы"». Для вырашэння ўзнятых на з'ездзе пытанняў і выпрацоўкі далейшай праграмы дзеянняў быў сфарміраваны губернскі выканкам у складзе 23 чалавек (старшыня А. А. Драздецкі). Віцебскі павятовы Савет сялянскіх дэпутатаў для вяскоўцаў выпісываў газеты, набываў літаратуру [5].

**Заключэнне**. У маі – ліпені 1917 г. такія тэмы, як харчовае (хлебная манаполія, цвёрдыя цэны і інш.) і зямельнае пытанні (дзейнасць зямельных камітэтаў, аграрная рэформа і інш.), дабрачынныя і асветніцкія праекты (пазыка свабоды, дапамога франтавікам і інш.), пастаянна станавіліся тэмай для абмеркавання як губернскіх, так і павятовых, валасных сялянскіх з'ездаў. Услед за Саветамі рабочых і салдацкіх дэпутатаў шэраг сялянскіх з'ездаў у сваіх пастановах у рэзкай форме выказаліся наконт дэзерціраў. Частка з'ездаў вырашыла пазбавіць дэзерцірцаў права ўдзелу ў маючай адбыцца аграрнай рэформе. Такія рашэнні спрыялі росту яўкі беглых вайскоўцаў да воінскіх камісій і начальнікаў. Выбарам сялян кіравала ў першую чаргу іх старадаўняя мара пра справядлівае размеркаванне зямельнай уласнасці і, у сваю чаргу, на форумах яны (сяляне) упэўніліся ва ўрадавых гарантыях правядзення аграрнай рэформы. Для дзяржавы і грамадска-палітычных сіл пытанне рэалізацыі харчовай праграмы па сваёй значнасці не саступала шэрагу іншых, вельмі важных галін унутранай і знешняй палітыкі – ваеннай, зямельнай, рэфармаванню органаў дзяржаўнага кіравання і інш. Праяўленнем палітычнай актыўнасці сялян з'яўлялася актыўная падтрымка харчовых урадавых мерапрыемстваў. І гэтую падтрымку на пачатковым этапе рэвалюцыі сяляне выказалі.

## Спіс літаратуры

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 626. Воп. 1. Спр. 1. Л. 2.
2. НАРБ. Фонд 60. Воп. 3. Спр. 186. Л. 11.

3. НАРБ. Фонд 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 198.
4. НАРБ. Фонд 60. Воп. 3. Спр. 262. Л. 235.
5. НАРБ. Фонд 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 115.

## References

1. *Natsional'nyy istoricheskiy arkhiv Belarusi (NIAB)* [National Historical Archive of Belarus (NHAB)]. Fund 626. I. 1. F. 1. P. 2.
2. NARB. Fund 60. I. 3. F. 186. P. 11.
3. NARB. Fund 60. I. 3. F. 242. P. 198.
4. NARB. Fund 60. I. 3. F. 262. P. 235.
5. NARB. Fund 60. I. 3. F. 242. P. 115.

## Інфармацыя пра аўтара

**Рыжанкоў Ігар Міхайлавіч** − кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: im@belstu.by

## Information about the author

**Ryzhankou Ihar Mikhaylavich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: im@belstu.by

*Паступіў 11.09.2024*